■ Ідзем на свята!

# РОЎНЫЯ І ТВОРЧЫЯ

**Сёння рэгіянальная кампанія «Інклюзіўная Беларусь: не пакідаючы нікога ў баку ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця» завяршаецца ў Мінску. На працягу апошніх дзесяці дзён гэты праект падарожнічаў па Беларусі і наведаў кожную вобласць, дзе падтрымаў ідэі па дасягненні Мэты 10 — памяншэнне няроўнасці.**

Цэнтральны чыгуначны вакзал сталіцы стане асноўнай пляцоўкай правядзення мерапрыемстваў. У 14.00 там адбудзецца афіцыйная цырымонія падпісання Заявы аб гатоўнасці не пакінуць нікога ў баку ў дасягненні Мэты ўстойлівага развіцця №10. З боку ўлад планецца ўдзел старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямёна Шапіры і старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэя Шорца. З боку ААН будуць удзельнічаць пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Санака Самарасінха, а таксама кіраўнікі агенцтваў ААН, прадстаўленых у Беларусі.

У гэты дзень пройдуць і святочныя мерапрыемствы. Так, на чыгуначным вакзале адкрываюцца фотавыставы «Даступнае асяроддзе», «Мост у будучыню», арт-інсталяцыя «Нябачныя», выставы пасольстваў Ізраіля, Палесціны і Італіі, а таксама іншыя праекты. Акрамя таго, пляцоўкамі для культурных мерапрыемстваў стануць бізнес-клуб «Imaguru», галерэя TUT.BY, сталічная школа №46, дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня». У кінатэатры «Перамога» пакажуць фільм «Прыстанак» у межах кінафестывалю «Чалавечая годнасць, роўнасць, справядлівасць». Уваход свабодны.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Саюзная дзяржава

# Нарэшце жанчыны!

### У сталіцы адбылася першая сустрэча дзелавых жанчын Беларусі і Расіі

**Гэты саюз маладзі — створаны сёлета ў жніўні. Але, як людзі звыклыя да хуткага вырашэння спраў і нацэленыя на вынік, жанчыны на кіруючых пасадах з Беларусі і Расіі вырашылі не адкладаць першую стратэгічную канферэнцыю.**

Рашэнне аб стварэнні адпаведнага клуба было прынята на сёлетнім Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі. На мінскай сустрэчы бізнесмены, дырэктары, намеснікі кіраўнікоў далёка не слабага полу прынялі праграму дзеянняў на найбліжэйшы час. Асноўныя яе кірункі — бізнес, дабрачыннасць, патрыятычнае выхаванне.

Сярод удзельніц шмат прадстаўніц з дзяржаўных органаў, навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў. Сярод іх — **намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын Надзея ЕРМАКОВА.** «Нарэшце жанчыны бяруць уладу ў свае рукі, — усміхаецца яна. — Уладу вытворчую і прадпрымальніцкую. Тым больш што на мерапрыемстве ёсць прадстаўніцы з рэгіёнаў і Беларусі, і Расіі. Гэта новыя кантакты, якія пасля змогуць дапамагчы ў вядзенні спраў. У гэтыя ж дні члены з нашага Саюза жанчын едуць у Маскву на форум «Жанчыны за аб'яднанне стваральных сіл у імя міру» падобным складам. Там — за мір, тут — па працы».

Члены Клуба дзелавых жанчын ставяць мэтай рэалізаваць у бліжэйшыя чатыры гады не менш за 30 беларуска-расійскіх праектаў у сферах вытворчай кааперацыі, гандлю, турызму, сферы паслуг, трансферу інавацый. А таксама распрацаваць праграмы імпартазамяшчэння на прасторы Садружнасці Незалежных Дзяржаў не меней чым у 5 галінах.

**Веранiка ПУСТАВIТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Факт

## ІНФЛЯЦЫЯ Ў ЛІСТАПАДЗЕ — 0,8%

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі сёлета за мінулы месяц у параўнанні з кастрычнікам склаў 100,8%, са снежнем 2015 года — 110,1%, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.**

Спецыялісты камітэта падлічылі, што базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі пад уздзеяннем фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам 2016 года склаў 100,7%. Эксперты адзначылі, што ў апошні месяц восені прыкладна на 1,5% падаражэлі прадукты, а вось цэны на нехарчовыя тавары выраслі толькі на 0,1%. Таксама няznачна (плюс 0,3%) за гэты час павялічыўся індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі. Аднак, калі яго параўноўваць з лістападам 2015 года, то павелічэнне цэн у гэтай катэгорыі складзе амаль 20%.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**по поручению Октябрьского (г. Минска) межрайонного отдела Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, обращенного в доход государства**

| № лота | Наименование | Начальная цена, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | **Гараж,** расположенный по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Корженевского, д. 20В, пом. 364. Площадь – 32,9 кв.м, инв. № 500/D-38658 | 9 270,00 | 920,00 | 5 |
| Лот №2 | **Гараж,** расположенный по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Горовца, д. 5, пом. 89. Площадь – 31,1 кв.м, инв. № 500/D-28831 | 11 160,00 | 1 100,00 | 5 |

()* – Цена указана в денежных знаках образца 2009 г.

**УСЛОВИЯ**

Участник аукциона, желающий принять участие в аукционе по нескольким объектам (лотам), вносит задаток в сумме, предусмотренной для каждого предмета торгов.
Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), ему присваивается статус «Претендент на покупку».
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан произвести оплату всей стоимости Объекта не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, обращенный в доход государства (имущество должника), осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 20.01.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже гаражей (Лот №__), проводимом 20 января 2017 г.
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6.
Окончание приема заявлений и задатков – **18.01.2017 в 11.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта аукциона по Лоту № 1: Политанская Инесса Николаевна, 8 (029) 160-19-84; по Лоту №2: Григорьев Александр Юрьевич, 8 (044) 795-73-37.
Организатор аукциона вправе снять лот с торгов по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



23 декабря 2016 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров Открытого акционерного общества «Татьяна» в соответствии с решением Наблюдательного совета от 08.12.2016 г.

Повестка дня:

1. О величине уставного фонда и номинальной стоимости акций общества.
2. О внесении изменений в устав общества и утверждении устава в новой редакции.
3. О сделках общества.

Местонахождение ОАО «Татьяна»: г. Гомель, ул. Павлова, 26.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Павлова, 26.
Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
Дата формирования реестра акционеров – 19.12.2016 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 19.12.2016 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400068248 Наблюдательный совет.


■ Студэнт года — 2016

# ЯРКІ, ХАРЫЗМАТЫЧНЫ, ІНТЭЛІГЕНТНЫ ЧАЛАВЕК-АРКЕСТР,

## які захапляецца вывучэннем дэмаграфіі

**Музычная кампазіцыя, прысвечаная Максіму Багдановічу, якую ў дзень яго 125-годдзя выканаў Дзмітрый КУКСО — уладальнік імяннай стыпендыі паэта, прынесла хлопцу перамогу ў фінале Рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года». І хоць заключная частка спаборніцтваў складалася з некалькіх конкурсных выпрабаванняў, менавіта апошняе, творчае, стала вырашальным. Тройка лідараў, дарэчы, акрэслілася ў фінале адразу. Але журы вырашыла захаваць інтрыгу да канца і не стала абвяшчаць свае ацэнкі канкурсантам за апошняе іх выступленне, таму ўсім заставалася гадаць, як размяркуюцца прызавыя месцы.**



— Самым складаным для мяне сёння было не выступаць, а стаяць на сцэне і чакаць, ці назавуць члены журы маё прозвішча. У мяне і зараз ногі падгінаюцца, — шчыра прызнаўся адразу пасля цырымоніі ўзнагароджвання новы ўладальнік звання «Студэнт года». — Што я зараз адчуваю? Напэўна, эйфарыю... Мы вельмі доўга ішлі да гэтай перамогі, шмат намаганняў прыклалі. І для мяне гэты вынік — канстатацыя таго, што мы з маёй камандай працавалі не дарэмна і ўсё зрабілі правільна... А гэта, між іншым, два месяцы падрыхтоўкі спачатку да абласнога, а затым і да рэспубліканскага этапаў. Я вельмі ўдзячны ўсім, хто быў увесь гэты час разам са мной: Хрысціне Кісловай, майму крэатыўнаму настаўніку, сакратару нашай пярвічкі БРСМ, Мікалаю Розуму, які абараняў гонар нашага ўніверсітэта ў фінале летась і стаў фактычна маім правадніком у закуліссі конкурсу, усім службам нашага ўніверсітэта, якія дапамаглі зрабіць крутое партфоліа. Маім родным, якія не дазвалялі спыніцца, і многім, многім іншым...



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Дзмітрый Куксо — будучы менеджар-эканаміст, вучыцца на чацвёртым курсе фінансава-эканамічнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сярэдні бал яго паспяховасці — 9,45.

— Пра мяне кажуць, што я яркі, харызматычны і інтэлігентны малады чалавек. Спадзяюся, што гэта так, — усміхаецца Дзмітрый.

Увесь вольны час хлопца займае музыка. Ён спявае, іграе на розных інструментах: баяне, гітары, духавых, а з нядаўняга часу і на блок-флейце (гэта ўменне ён, дарэчы, і прадэманстраваў у сваёй конкурснай музычнай кампазіцыі). «А ўлічваючы, што і мае сябры — такія ж разнапланавыя музыканты, разам мы ператвараемся ў цэлы аркестр! Ну, а калі сур'ёзна, то музыка — гэта лекі і крыніца сіл для маёй душы ў любой сітуацыі», — прызнаецца ён.

Дарэчы, праект, які Дзмітрый абараняў перад журы, уяўляе сабой мабільную праграму «Насустрач». Яго ідэя заключаецца ў аб'яднанні аднадумцаў.

— Скажам, мы з сябрамі збіраемся зладзіць на вуліцы маленькі імправізаваны канцэрт. Праз мабільную праграму мы паведамляем усім, хто спампаваў такую ж праграму на свой смартфон, пра наш намер. І ўсе, каму гэта цікава, могуць прыйсці нас паслухаць, — тлумачыць ён. — Такім жа чынам могуць сустракацца ў вызначаным месцы ў вызначаны час, напрыклад, паркуршчыкі, танцоры, веласіпедысты, аматары экстрэмальнага турызму і іншыя.

Ва ўніверсітэце малады чалавек захапіўся навукай, стаў сур'ёзна вывучаць пытанні, звязаныя з дэмаграфіяй і ўстойлівым развіццём, удзельнічаць у навукова-практычных канферэнцыях. Напісаў дзве навукова-даследчыя работы, кожная з якіх адзначана дыпломам на рэспубліканскім конкурсе, мае дзевяць навуковых публікацый. Кажа, што ёсць шмат ідэй для далейшых даследаванняў і абяцае ў хуткім часе імі заняцца.

— Увогуле я чалавек сур'ёзны і цаню ў людзях грунтоўнасць, хоць часам і падурэць таксама можна, і нават трэба. Цаню ў людзях дабрыню і бескарыслівасць і адказваю тым жа. Паважаю людзей са светлай галавой: стасункі з імі і мяне робяць лепшым, — прызнаецца малады чалавек.



Любімая яго кніга — «Усё лепшае, што не купіш за грошы» футуролага Жака Фрэско. «Калі б усе яе прачыталі, свет стаў бы лепшым», — упэўнены ён.

Дзмітрый лічыць сябе грамадзянінам свету. Цэніць культуру сваёй краіны, але пры гэтым паважае культуры іншых народаў. Перакананы, што чалавек варты большага, чым проста зарабляць грошы на існаванне — ён павінен рэалізоўваць свой творчы патэнцыял у тых сферах, у якіх мае здольнасці: гэта могуць быць навука, музыка, мастацтва...

Як прызнаўся пераможца, галоўным сваім сапернікамі ў фінале ён лічыў Вераніку Кажанеўскую, студэнтку Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, і Андрэя Андрука, другакурсніка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. І не памыліўся: яны заваявалі ў фінале адпаведна другое і трэцяе месцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*